Разгледжана работа Рэспубліканскага фізкультурна-спартыўнага клуба «Сувязіст»

31 кастрычніка 2019 гады прайшло пасяджэнне калегіі Міністэрства сувязі і інфарматызацыі Рэспублікі Беларусь у фармаце відэаканферэнцыі з падключэннем абласных і раённых студый. Асноўным пытаннем, на якім разглядаліся вынікі сацыяльна-эканамічнага развіцця галіны за дзевяць месяцаў бягучага года.

Паўнавартасна па змесце і арганічна па сваёй сутнасці ўвайшло ў парадак праведзенага пасяджэння Калегіі Мінсувязі даклад аб рабоце Рэспубліканскага фізкультурна-спартыўнага клуба «Сувязіст», з якім выступіла старшыня Беларускага прафесійнага саюза работнікаў сувязі Ніна Сямёнава Гаўрылава. На пасяджэнні было адзначана, што асноўнымі задачамі РФСК «Сувязіст» з'яўляюцца актывізацыя фізкультурна-аздараўленчай і спартыўна-масавай работы, папулярызацыя здаровага ладу жыцця, каардынацыя дзейнасці клубаў па фізічнай культуры і спорце ў арганізацыях галіны сувязі. У ліку прыярытэтных задач - умацаванне здароўя насельніцтва.

Рэспубліканскі фізкультурна-спартыўны клуб «Сувязіст» аб'ядноўвае 216 клубаў па фізічнай культуры і спорце. У мэтах прыцягнення работнікаў да пастаянных заняткаў фізічнай культурай і спортам у арганізацыях галіны працуюць секцыі па многіх папулярных відах спорту, праводзяцца спартакіяды, фізкультурныя святы і турыстычныя злёты.

Згодна з тарыфным пагадненнем, заключаным паміж Міністэрствам сувязі і інфарматызацыі Рэспублікі Беларусь і Беларускім прафесійным саюзам работнікаў сувязі на 2019-2021 гады, калектыўным дагаворах арганізацый фінансаванне спартыўных мерапрыемстваў ажыццяўляецца за кошт сродкаў арганізацый і Беларускага прафесійнага саюза работнікаў сувязі.

За дасягненне высокіх спартыўных вынікаў, значны ўклад у развіццё фізкультурнага руху прысвойваецца ганаровае званне «Спартсмен года галіны сувязі» і «Ветэран фізкультурнага руху». Пачынаючы з 2011 года ганаровых званняў удастоены 158 спартсменаў і 112 ветэранаў.

У 2019 года ў арганізацыі галіны распаўсюджаны вопыт работы клуба па фізічнай культуры і спорце Гродзенскага філіяла РУП "Белтэлекам".

Калегіяй Міністэрства сувязі інфармацыя прынятая да ведама. Клубам па фізічнай культуры і спорце рэкамендавана працягнуць працу па выкананні нарматываў Дзяржаўнага фізкультурна-аздараўленчага комплексу Рэспублікі Беларусь.

Старшынёй Рэспубліканскага фізкультурна-спартыўнага клуба «Сувязіст» зацверджаны С.А. Несцяровіч, першы намеснік міністра сувязі і інфарматызацыі Рэспублікі Беларусь.

Source URL: *https://www.xn--b1akbcqh2a7i.xn--90ais/news/01-11-2019-5508*